*І.І.Бамбешка*
(Мінск)

# Экспедыцыйнае даследаванне Лагойшчыны ў 1923 г.

У 1923 г. адной з галоўных падзей у жыцці Беларусі стаў удзел у І Усерасійскай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выстаўцы (15 жніўня – 15 лістапада), дзе быў афармлены замежны аддзел. Для падрыхтоўкі беларускага павільёна быў створаны Белвысткам, у які ўвайшлі прадстаўнікі ад розных наркаматаў. У складзе апошніх, у сваю чаргу, арганізоўваліся галіновыя камісіі па падрыхтоўцы ўдзелу таго ці іншага камісарыята ў выстаўцы.

У складзе Наркамата асветы таксама была створана аналагічная камісія, у склад якой увайшлі інспектар навуковых устаноў С.М.Некрашэвіч (старшыня камісіі), загадчык Мінскага абласнога музея П.В.Харламповіч, супрацоўнік Цэнтрархіва М.В.Мялешка і прадстаўнік БДУ [2, арк. 40 адв.]. У абавязкі камісіі ўваходзіў збор прадметаў, якія маглі б быць паказаны на выставе ад Наркамата асветы, і сабраць аб іх звесткі. Таксама на Наркамат асветы было ўскладзена афармленне XIV аддзела выставы – аддзела хатняй гаспадаркі і побыту, які павінен быў адлюстраваць этнаграфічныя асаблівасці беларусаў.

І вось менавіта для збору прадметнага напаўнення гэтага аддзела Наркамат асветы БССР 23 красавіка 1923 г. выдаў загад аб арганізацыі этнаграфічнай экспедыцыі, якую было вырашана скарыстаць і для правядзення маштабнага навуковага даследавання побыту, этнаграфіі, геаграфіі і археалогіі Беларусі [9, арк. 120]. Для работы ў экспедыцыі былі запрошаны намеснік загадчыка Цэнтрархіва М.В.Мялешка, супрацоўнік Інбелкульта М.В.Азбукін, навуковы супрацоўнік Цэнтрархіва А.А.Шлюбскі (ён замяніў прафесара музыкі з Петраградскага інстытута

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музычных ведаў Я.Я.Палфёрава, які затрымаўся ў Маскве) і мастак-фатограф Л.У.Дашкевіч [7, арк. 47; 10, с. 3].

У задачы экспедыцыі ўваходзіла этнаграфічнае вывучэнне вёсак, хутароў, саўгасаў, мястэчак Беларусі, набыццё прадметаў хатняга ўжытку і вядзення гаспадаркі для экспанавання іх на І Усерасійскай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выстаўцы, а таксама для музея. Акрамя таго, члены экспедыцыі павінны былі зрабіць апісанне, замалёўкі набытых прадметаў, а таксама сфатаграфаваць гэтыя прадметы і беларускія краявіды.

Для абследавання былі вылучаны Ігуменскі, Бабруйскі, Мазырскі і Слуцкі паветы – практычна ўся тагачасная Беларусь.

Першая экспедыцыя Інбелкульта адбылася з 8 па 19 мая 1923 г. па маршруце ст. Руденск – вёскі Цытва і Сергіевічы Цытвянскай воласці – мястэчка Шацк – вёска Хатляны – мястэчка Лоша – вёска Даўгінавічы – мястэчка Узда – Мінск. У час экспедыцыі было сабрана каля 340 прадметаў этнаграфічнага характару. Фатографам экспедыцыі Л.У.Дашкевічам было зроблена шмат фотаздымкаў беларускіх сялян, фатаграфічна зафіксаваны розныя моманты паўсядзённага сялянскага жыцця і працы [1, с. 163]. Сабраны матэрыял паступіў у этнаграфічны аддзел Мінскага абласнога музея.

Вынікі першай экспедыцыі паказалі, што пастаўленыя перад ёю задачы не да канца выкананы і сабранага матэрыялу недастаткова для таго, каб даць яскравы малюнак быту Беларусі ў адпаведным аддзеле сельскагаспадарчай выставы. Таму было вырашана правесці шэраг дадатковых экспедыцый з тымі ж мэтамі, для чаго агульны склад экспедыцыі разбіваўся на некалькі больш дробных груп і папаўняўся новымі членамі, сярод якіх былі загадчык Цэнтрархіва З.Х.Жылуновіч, мастак, супрацоўнік Мінскага абласнога музея М.М.Філіповіч, інспектар навуковых устаноў С.М.Некрашэвіч, а таксама вядомы кампазітар, кіраўнік беларускага хору У.В.Тэраўскі [8, с. 4]. Дарэчы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

апошні нават быў датэрмінова вызвалены са Смаленскай турмы, дзе ён адбываў пакаранне [3, с. 71].

Для нас найбольш цікавай з'яўляецца экспедыцыя ў складзе А.А.Шлюбскага і мастака-фатографа Л.У.Дашкевіча, якая была накіравана ў мястэчка Лагойск і яго ваколіцы [4, арк. 172; 5, с. 3]. Ім даручалася даследаваць сялянскую гаспадарку, даць падрабязнае яе апісанне, а таксама сабраць матэрыялы для стварэння ў будучым на І Усерасійскай выставе мадэлі тыповай сялянскай сядзібы. І тут А.А.Шлюбскі, па яго ўласных успамінах, сутыкнуўся з пэўнай праблемай – адсутнасцю больш-менш яснай праграмы апісання вясковай сялянскай гаспадаркі [11, арк. 69]. У якасці ўзору ён вымушаны быў выкарыстаць праграму "па апісаньню жылля Харузіна, выдрукаваную ім ў дарэвалюцыйны час" [12, арк. 162]. Па ўсёй верагоднасці, А.А.Шлюбскі меў на ўвазе праграму для збірання звестак пра сялянскія пабудовы, падрыхтаваную вядомым расійскім гісторыкам архітэктуры А.М.Харузіным, апублікаваную ў 1902 г. выдавецтвам Імператарскага Рускага геаграфічнага таварыства [13]. Таму даследчыкам былі зроблены ў асноўным тэхнічныя апісанні, неабходныя для стварэння мадэлі тыповай сялянскай гаспадаркі.

У час экспедыцыі А.А.Шлюбскі даследаваў мястэчка Лагойск Барысаўскага павета, а таксама шэраг вёсак (Астрожка, Аўгустова, Зазер'е, Залессе, Міхалова, Румелькава, Старынкі, Цераховічы, Цілічы, Чудзінічы), дзе было агледжана мноства вясковых хат, зроблены адпаведныя фатаграфічныя здымкі. Са значнай колькасці вясковых будынкаў найбольш тыповай аказалася хата ў в. Зазер'е, пабудаваная ў 1870-я гг. Падобны тып жылога сялянскага будынка захоўваўся на Барысаўшчыне даволі доўга, і нават пры будаўніцтве новых дамоў прытрымліваліся менавіта гэтага тыпу [5, с. 3]. Акрамя таго, у час экспедыцыі былі набыты рэчы, сярод якіх найбольш цікавымі аказаліся, па ўспамінах А.А.Шлюбскага, кросны, частка якіх была

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зроблена каля 100 гадоў таму, і 2 сахі. Усе сабраныя рэчы характарызавалі традыцыйны беларускі сялянскі побыт.

Сябрам экспедыцыі, вядомым мінскім фатографам Л.У.Дашкевічам было зроблена некалькі дзесяткаў фотаздымкаў, галоўным чынам Лагойска і вакольных вёсак. Натуральна, што у Лагойску цікавасць фатографа прыцягнуў палац Тышкевічаў, які тады яшчэ існаваў, і быў цікавым з "гістарычнага і архітэктурнага бакоў".

Акрамя архітэктурных помнікаў Л.У.Дашкевіч здымаў пейзажы, бытавыя сцэны і інш. А.А.Шлюбскі ўзгадваў, што "былі зняты 2 стогадовыя старыя: жыд і беларус. ...Другі, маючы каля 110 гадоў, апавядаў шмат пра часы прыгону і здзекі паноў над беларускім сялянствам у Лагойску" [5, с. 3].

Усе сабраныя прадметы былі перададзены ў распараджэнне Белвысткама і захоўваліся да адпраўкі на выстаўку ў Маскву ў Мінскім абласным музеі.

З экспедыцыйных фотаздымкаў Л.У.Дашкевічам былі зроблены шкляныя дыяпазітывы, дэманстрацыя якіх адбылася 2 лютага 1924 г. у Клубе працаўнікоў асветы ў Мінску, аб чым пісалі ў цэнтральных газетах "Звязда" і "Савецкая Беларусь". Частка з фатаграфічнай спадчыны апошняга захоўваецца ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі [6, с. 27]. Там знаходзяцца і фотаздымкі з экспедыцыі ў Лагойск і ваколіцы, на якіх адлюстраваны тыповыя сялянскія будынкі, элементы іх інтэр'ера, віды Лагойска і, безумоўна, палац Тышкевічаў.

1. *Беларуская* этнаграфічная экспедыцыя // Полымя. – 1923. – № 5–6.

2. *Выпіска* з загада № 32 Народнага камісарыята асветы ад 3 сакавіка 1923 г. // НАРБ. – Ф. 42. – Воп. 1. – Спр. 534. – Арк. 18.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Гесь, А.* “Калі песня жыве беларуса, будзе жыць і беларускі народ”. Жыццёвы і творчы шлях Уладзіміра Тэраўскага / А.Гесь, У.Ляхоўскі // Мастацтва. – 1996. – № 2.
4. *Загад* Народнага камісарыята асветы № 93, § 5 // НАРБ. – Ф. 42. – Воп. 1. – Спр. 210. – Арк. 172.
5. *Казальнік*. З працы этнаграфічнай экспедыцыі (м. Лагойск, Барысаўскі павет) // Савецкая Беларусь. – 1923. – 14 чэрвеня.
6. *Лев* Урбанович Дашкевич (1882–1957): каталог фотографий / Нац. музей истории и культуры Беларуси; [авт.-сост. Н.И.Савченко]. – Мн., 2002.
7. *Мандат* М.В.Мялешку // НАРБ. – Ф. 42. – Воп. 1. – Спр. 534. – Арк. 47.
8. *Працяг* працы этнаграфічнай экспедыцыі // Савецкая Беларусь. – 1923. – 31 мая.
9. *Приказ № 57* по Наркомпросу Белоруссии от 23 апреля 1923 г. // НАРБ. – Ф. 42. – Воп. 1. – Спр. 210. – Арк. 120.
10. *Савецкая* Беларусь.– 1923.– 10 мая.
11. *Службовы* допіс А.А.Шлюбскага на імя намесніка народнага камісара асветы А.В.Баліцкага ад 17 ліпеня 1923 г. // НАРБ. – Ф. 42. – Воп. 1. – Спр. 534. – Арк. 69.
12. *Службовы* допіс А.А.Шлюбскага на імя намесніка народнага камісара асветы А.В.Баліцкага ад 12 жніўня 1923 г. // НАРБ. – Ф. 42. – Воп. 1. – Спр. 534. – Арк. 162.
**13. Харузин, А.** ***Руководство для собирания сведений о крестьянских постройках / А.Харузин. – СПб., 1902.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ